УДК 37(476)(091)“17”

# ШКОЛЬНЫЯ СТАТУТЫ ПОЛЬСКАЙ (1756) і ЛІТОЎСКАЙ (1762) ПРАВІНЦЫЙ ПІЯРСКАГА ОРДЭНУ: АГУЛЬНАЕ ДЫ АДМЕТНАЕ

**Самусік А. Ф.**
Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”
(г. Мінск, Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле аналізуюцца піярскія школьныя статуты, падрыхтаваныя пад уплывам эпохі Асветніцтва для школ Польскай (1756) і Літоўскай (1762) правінцый. Паказаны больш прагрэсіўны характар першага з іх. Адзначана, што другі насіў памяркоўны характар з-за моцных кансерватыўных настрояў, як сярод тутэйшых членаў ордэна, так і ў грамадстве ВКЛ.

Ключавыя словы: эпоха Асветніцтва, рэфармаванне адукацыі, піярскі ордэн, школьнае заканадаўства, вучэбна-выхаваўчы працэс.

Summary. The article analyzes the piarists school charters prepared under the influence of the Enlightenment for schools in the Polish (1756) and Lithuanian (1762) provinces. The more progressive nature of the first of them is shown. It is noted that the second had a moderate character, due to strong conservative sentiments, both among the local members of the order and in the society of the GDL.

Key words: the Enlightenment, educational reform, piarists order, school legislation, educational process.

Пад уплывам эпохі Асветніцтва адукацыя ў Рэчы Паспалітай з сярэдзіны XVIII ст. пачала ўдасканальвацца ў бок яе прыстасавання пад патрэбы дзяржавы ды грамадства. Вучэбныя праграмы сваіх школ мадэрнізавалі прадстаўнікі розных канфесій. Найбольш упартая барацьба разгарэлася паміж езуітамі ды піярамі, якія праз прагрэсіўныя змены ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу імкнуліся ўмацаваць сваё становішча ў краіне.

Першыя з іх пайшлі шляхам простага пашырэння колькасці прадметаў, а іх размеркаванне па класах ды рэгулярнасць выкладання залежыла ад рэктараў ды наяўнасці адпаведна падрыхтаваных настаўнікаў, што ўносіла відавочны хаос у рэарганізацыю школьнай справы. У сваю чаргу, піяры вырашылі прыдаць ёй больш сістэматызаваны характар, спрыяць чаму павінны былі спецыяльна складзеныя нарматыўныя дакументы. Зрабіць гэта на ўзроўні ўсяго ордэну не ўдалося з-за living рознага стаўлення да адукацыйнай рэформы кіраўніцтва асобных правінцый. Для выпрацоўцы агульнай пазіцыі патрабавалася шмат часу, а таму правінцыялам было дазволена самім распрацаваць зыходныя прынцыпы фунцыянавання падначаленых ім навучальных устаноў.

Пераход да суцэльнай адукацыйнай рэформы ў Польскай правінцыі піяраў пачаўся пасля зацвярджэння капітулай у Ловічы ў 1753 г. новага Школьнага статуту. 15 лютага 1754 г. яго ўхваліў ва ўласным брэве папа рымскі Бенедыкт XIV. Разам з тым, канчатковая рэдактура ды выданне статута зацягнулася – толькі ў 1756 г. ён быў надрукаваны і разасланы для ўжытку па абіцелях на каронных землях [1, s. III–V, XV]. Галоўнай яго заслугай стала выпрацоўка агульнага падыходу да мадэрнізацыі навучальнага курсу. Быў дакладна вызначаны пералік прадметаў па класах: 1-ы клас (парва) – скарочаны катэхізіс, лацінская граматыка, асновы арыфметыкі, царкоўнай гісторыі і геаграфіі; 2-і клас (інфіма) – катэхізіс, лацінскі сінтаксіс, пераклады з латыні на польскую мову, арыфметыка, геаметрыя, айчынная гісторыя і геаграфія; 3-і клас (граматыка) – катэхізіс, пераклады з латыні, арыфметыка, геаметрыя, гісторыя чатырох манархій з вывучэннем біяграфій знакамітых асоб; 4-ы клас (сінтаксіс) – польская і лацінская мовы, алгебра, трыганаметрыя; 5-ы клас (гуманітас) – польская і лацінская мовы, фізіка, прыродазнаўства, астраномія; 6-ы клас (рыторыка) – красамоўства, прыроднае і айчыннае права. На працягу ўсёй вучобы, юнакі вывучалі французскую і нямецкую мовы [1, s. 40–126].

Відавочна, што ініцыятар падрыхтоўцы гэтага статута польскі правінцыял С. Канарскі заклаў у ім асновы якасна новай пабудовы навучальнага працэса, надаўшы яму набліжаны да сучаснага агульнаадукацыйны выгляд [2, s. 26–34]. Змянілася нават выкладанне латыні з рыторыкай. Так, гэтыя дысцыпліны па традыцыі ўяўлялі сабою адзінае цэлае і шмат што тут засталося нязменным. Па-ранейшаму акцэнт рабіўся на ўдасканальванні памяці – вучні 4-а класа, напрыклад, на кожным занятку павінны былі вывучыць 30 лацінскіх слоў і яшчэ 50 ім давалася штодзень у якасці хатняга задання. Разам з тым, выніковая мэта дадзеных прадметаў заключалася не ў бездумным запамінанні, вырваных з кантэкста, фраз ці словазваротаў, а ў разумовым авалоданні класічнай латынню і атрыманні навыкаў да самастойнага яе выкарыстання ў жыцці. Выпрацаваны С. Канарскім ідэал аратара зыходзіў з яго актыўнай ідэйна-грамадзянскай пазіцыі, а таму адвяргаў мудрагелістае ды пышнае барочнае шматслоўе, а таксама істотна зменшыў ролю курса паэтыцы, якая, на яго думку, з’яўлялася толькі праявай асабістых талентаў ды добрай адукаванасці [1, s. 27–33].

Па-новаму падыйшлі піяры да маральнага выхавання, якому яны прысвячалі асобныя заняткі. Традыцыйныя хрысціянскія каштоўнасці былі дапоўнены імі грамадзянска-патрыятычным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выхаваннем моладзі. Вострыя пытанні паўсядзённасці павінны былі абмяркоўвацца на ўроках па рыторыцы. Вучням прапаноўвалася каля 200 тэм для абмеркавання ў залежнасці ад "становішча ў краі і асабістай зацікаўленасці" – пераважна яны датычыліся праблем тагачаснай адукацыі (стварэнне дзяржаўнага органу кіравання школьнай справай, шкоднасць несістэматычнага замежнага навучання), узаемаадносін цэнтральнай улады і грамадства (узмацненне аўтарытэту караля), дзейнасці соймаў (пераход да пастаяннай працы з правам прыняцця рашэнняў большасцю галасоў), фінансаў (забарона вывазу за мяжу буйных сум грошаў), арміі (яе пашырэнне, пераўзбраенне і рэгулярны характар), гандлю (арганізацыя дзяржаўных манаполій, ураўнанне правоў шляхты і мяшчанства), саслоўяў (абавязковыя для ўсіх падаткі, больш простая працэдура пазбаўлення шляхецтва за несамавітыя ўчынкі) і г.д. Пры гэтым, часам яны выносіліся на вучнёўскія "соймікі", якія ў піяраў праводзіліся публічна – звычайна ў мясцовым касцёле. Настаўнікі раілі вучням весці сабе стрымана і разважліва, каб паказаць прыклад сапраўдным тагачасным дэпутатам. Да таго ж, яны забаранялі выхаванцам ужываць права "liberum veto", каб прадэманстраваць грамадству яго шкоднасць [1, s. 29, 33–37].

Раўнавартаснымі з латынню ды красамоўствам прадметамі станавіліся гісторыя і матэматыка. Першая з іх павінна была ахопліваць не толькі асноўныя этапы эвалюцыі чалавецтва (з антычнасці), але і асобныя краіны (Францыя, Германія, Англія, Іспанія, Галандыя, Швецыя, Данія, Венецыя і інш.). Што ж датычыцца другой, то ў класах да сінтаксіса ўключна раздзел па арыфметыцы быў далучаны да падручніка па польска-лацінскай граматыцы С. Канарскага. Настаўнікаў абавязвалі прасачыць за якасным засваеннем яе асноў вучнямі, бо яна: "адна з найбольш неабходных рэчаў у паўсядзённым жыцці". Значная ўвага ў піярскіх навучальных установах пачала ўдзяляцца паліталогіі ды правазнаўству, вывучэнне якіх ішло ў злучэнні з рыторыкай. У Школьным статуце адзначалася, што выкладаць іх неабходна вельмі асцярожна і з улікам існуючага ў Рэчы Паспалітай ладу – не падвяргаючы вострай крытыцы дзяржаўную сістэму кіравання ды не патрымліваючы адну з магнацкіх групоўак (асобна рэкамендавалася вельмі асцярожна адносіцца да пытання элекцыі караля) – каб не выклікаць абурэнне грамадства ці кагосьці з выхаванцаў. З вышэй азначаных тэм для дыскусій раілася абіраць тыя, да якіх больш схільны навучэнцы канкрэтнага класа [1, s. 87–100, 487–488].

Фізіка ў піяраў была фактычна аддзелена ад філасофіі, аб'яднана з алгебрай і насычана інфармацыяй, атрыманай вопытным шляхам. Сама ж філасофія ўспрымалася імі ў выглядзе ўніверсальнай навукі аб усіх рэчах, іх асновах і прычынах, разуменне сутнасці якіх карысна тэолагам, юрыстам, медыкам і г.д. Асноўная яе задача бачылася ў злучэнні розных відаў пазнанняў (гістарычнага, матэматычнага) у агульнае ўяўленне аб свеце. Спалучэнне ж філасофскіх пастулатаў з маралізатарска-паліталагічнымі разважаннямі мела на мэце пошук спосабаў "ашчаслівлення" Айчыны і выпраўленне "звычаяў польскіх" (праз зварот да хрысціянскай маралі ды ўдасканаленне заканадаўства на аснове прыроднага права) [1, c. 126–135].

Разам з тым, усе азначаныя вышэй асветніцкія захады С. Канарскага і яго паплечнікаў у поўнай меры датычыліся выключна Польскай правінцыі ордэна. На тэрыторыі ж ВКЛ з 1736 г. існавала асобная Літоўская правінцыя, у якой знайшлося шмат пратыўнікаў падобных прагрэсіўных зрухаў. Яны працяглы перыяд блакавалі пачатак працэсу рэфармавання вучэбных праграм мясцовых школ. Толькі ў 1762 г. кіраўнік Літоўскай правінцыі К. Тшэшкоўскі і правінцыйны сакратар Е. Цяпінскі перапрацавалі Школьны статут С. Канарскага, прыстаўваўшы яго да куды больш кансерватыўнага светапогляду, як самiх тутэйшых піяраў, так і айчынных магнацка-шляхецкіх колаў [3, s. 3, 21].

Якраз таму, прыняты ў Літоўскай правініцыі варыянт Школьнага статута ў пэўнай ступені адрозніваўся ад распрацаванага С. Канарскім. Яго складальнікі вельмі апасаліся адкрытай адмовы рэфармаваць вучэбныя праграмы з боку кіраўніцтва асобных калегіўмаў ды іх настаўнікаў. Менавіта таму яны імкнуліся максімальна зменшыць падабенства ўласных адукацыйных навацый з тымі, што пашыраліся ў Польскай правінцыі. Вынікам гэтага стала поўная адсутнасць у дадзеным дакуменце прозвішча С. Канарскага (нават калі гаворка ішла пра яго польска-лацінскую граматыку). Узамен была агучана ідэя заснавальніка ордэна Й. Каласантыя аб дасягненні дасканаласці ў навучанні праз аднастайнасць вучэбных метадаў, што прывядзе да гармоніі ўнутры выкладчыцкіх калектываў [4, s. II–IV, 22].

Статут 1762 г. фактычна ўяўляў сабою схематычны пераказ 4-й частцы "Аб школах" статута Польскай правінцыі, прыстасаваны пад рэаліі піярскіх калегіўмаў у ВКЛ. Так, узамен 6-класнай структуры ў ім вучэбная праграма была падзелена на чатыры класы (з магчымасцю іх скарачэння да трох). Па прычыне недахопу настаўнікаў ды аўдыторый разам вучыліся вучні 1-2 і 3-4 класаў (адпаведна найменаваліся інфімай ды граматыкай). Выхаванцы 5 ды 6 класаў (гуманітатыс і рыторыка) маглі наведваць заняткі, як паасобку, так і разам – акрамя вышэй згаданых прычын гэтаму магла паспрыяць іх нешматлікасць, бо часцяком бацькі забіралі сваіх дзяцей пасля заканчэння пачатковага курсу. Пры гэтым, з улікам вялікай колькасці вучняў малодшых класаў піяры ў ВКЛ былі вымушаны ўжываць методыкі, набліжаныя да будучай бел-ланкастарскай сістэмы ўзаемнага навучання (узнікла ў Англіі ў 1798 г.): на першым уроку ўсе класы вучыліся асобна, на другім – старэйшыя выхаванцы працавалі з малодшымі, на трэцім – настаўнік праводзіў выніковае апытанне засвоенага матэрыялу [4, s. 17–23, 40–41].

Важнай адметнасцю дакумента стаў дазвол вучням малодшых класаў ужываць у размовах паміж сабою ды настаўнікам "дакладную мову польскую". Толькі ў дачыненні да выкладання рыторыцы К. Тшэшкоўскі і Е. Цяпінскі не ўнеслі істотных карэктыў у пастулаты С. Канарскага і нават цалкам перадрукавалі ўсе 200 тэм для абмеркавання на занятках. Затое, уключэнне новых прадметаў у вучэбную праграму імі хоць і пацвярджалася, але падрабязна не распісвалася. Наконт гісторыі з геаграфіяй адзначалася, што выкладацца яны будуць на працягу ўсяго часу навучання і ахопліваць біблейскі, старажытны і сучасны (з паліталагічным падтэкстам) перыяды. Пытанні звязаныя з Рэччу Паспалітай вывучаліся ў класе рыторыцы – яе мінулае дзялілася на 6 частак і прадугледжвала разгляд падзей ад дахрысціянскіх часоў да праўлення караля Аўгуста III. Аднак, метадычныя рэкамендацыі С. Канарскага, таксама як і пералік падручнікаў былі прапушчаны, што пры адсутнасці адпаведнай падрыхтоўцы настаўнікаў істотна ўскладняла працу па ўкараненню дадзенага прадмета ў вучэбны курс. Матэматыку таксама загадвалася праходзіць ва ўсіх класах з акцэнтам на рашэнні разнастайных задач, якія павінны былі дапамагчы вучням на практыцы засвоіць правілы. Але і тут абранне дапаможніка ўскладвалася непасрэдна на настаўнікаў [4, s. 29–30, 34–35, 42–64, 67, 70–71, 76, 85–86].

Даволі ліберальна ставіліся ўлады Літоўскай правінцыі да падтрымання дысцыпліны ў асяроддзі настаўнікаў, кантроль за паводзінамі якіх у Польскай правінцыі быў куды больш жорсткім. У піярскіх школах на тэрыторыі ВКЛ настаўнікаў таксама абавязвалі ўваходзіць у клас адначасова са званком, але палажэнне аб вынясенні вымовы ці больш значнага пакарання для спазніўшыхся адсутнічала. Былі прапушчаны і ўказанні наконт паводзін настаўнікаў у класах у час чытання малітвы ды ў па-за вучэбны час. Не патрабавалася ад іх і дакладнага выканання планаў кожнага занятку, а ад адказных за малодшыя класы – глыбокіх ведаў усіх прадметаў ды ўсебаковай начытанасці. Цалкам ігнаравалася барацьба С. Канарскага з пашыраным сярод настаўнікаў п'янствам – уведзеныя ім з гэтай нагоды жорсткія пакаранні нават не ўзгадваліся. Няма ў літоўскім варыянце Школьнага статута і надзвычай эмацыйнага закліка да настаўнікаў, каб яны выходзілі з класа пасля ўроку такімі стомленнымі, быццам бы атлеты з арэны ды каб для добрай славы, служэння Айчыне, законам і будучыні краіны выконвалі, як мага больш добрасумленна усе ўласныя абавязкі [4, s. 1–9].

У цэлым, аналіз Школьнага статуту Літоўскай правінцыі сведчыць аб тым, што ў ходзе мадэрнізацыі піярскай сістэмы адукацыі ў ВКЛ ён выконваў іншую функцыю, чым аналагічныя нарматыўна-метадычныя распрацоўкі С. Канарскага ў Польскай правінцыі. У апошняй яны вызначылі канкрэтныя напрамкі рэфармавання вучэбных праграм мясцовых калегіўмаў. У



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сваю чаргу, варыянт К. Тшэшкоўскага і Е. Цяпінскага стаў дэкларатыўным "пускавым механізмам", які даў афіцыйны дазвол на мадэрнізацыю школьнай справы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Konarski, S. Ustawy szkolne / S. Konarski / oprac. J. Czubek [i inn.]. – Krakow : M. Arct i Społka. 1925. – XVI, 511 s.
2. Kot, S. Reforma czkolna Stanisława Konarskiego / S. Kot. – Krakow : Druk. W. Anczyca i Spólki, 1923. – 40 s.
3. Kurdybacha, Ł. Reforma litewskich szkół pijarskich w 1762 r. / Ł. Kurdybacha // Rozprawy z Dziejow Oswiaty. – 1972. – T. 15. – S. 3–23.
4. Trzeszczkowski, G. Methodus docendi pro Scholis Piis provinciae Lituaniae / G. Trzeszczkowski, G. Ciapiński – Vilnae : Typis Schol. Piar, 1762. – IV, 86 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова